ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В.Клімовіч
2023 г.

**ІНСТРУКЦЫЯ**
**аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору “ПАНЯМОННЯ ЖЫВАТВОРНЫЯ КРЫНІЦЫ”**

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору “Панямонне жыватворныя крыніцы” (далей - Фестываль).

2. Мэтамі і задачамі Фестывалю з’яўляюцца: захаванне, падтрымка і актуалізацыя рэгіянальнай і лакальнай традыцыйнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны; адраджэнне, развіццё, папулярызацыя лепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнай культуры і мастацтва; выяўленне самабытных носьбітаў беларускага фальклору, захаванне іх творчасці, пашырэнне межаў іх дзейнасці; далучэнне дзяцей, падлеткаў, моладзі да гісторыка-культурнай спадчыны сваёй краіны і прапаганда традыцыйнай народнай творчасці Панямоння, стварэнне ўмоў для эфектыўнай самарэалізацыі моладзі ў інтэрнэт-прасторы; павышэнне ўвагі да вывучэння мясцовых нацыянальных традыцый песенна-танцавальнага жанру, гульнёва-абрадавай спадчыны Гродзеншчыны, павышэнне турыстычнай прывабнасці Панямоння.

3. Арганізатарамі Фестывалю з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, аддзел культуры Гродзенскага гарвыканкама, аддзелы культуры Ваўкавыскага, Гродзенскага, Лідскага, Смаргонскага, Навагрудскага райвыканкамаў (Дадатак 1).

4. Фестываль адбываецца 1 раз у 2 гады.

5. Фестываль праводзіцца ў два туры: 1 тур – занальныя агляды-конкурсы (Дадатак 2); 2 тур – заключныя мерапрыемствы.

6. У 1 туры Фестывалю прымаюць удзел лепшыя фальклорныя калектывы і індывідуальныя выканаўцы, майстры народнай творчасці, этнаблогеры-пачаткоўцы.

7. Для ўдзелу ў 1 туры кожны раён за тыдзень да правядзення занальнага агляду-конкурсу (Дадатак 2) на электронны адрас ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” (info@gromc.by) прадстаўляе:
заяўку (Дадатак 3), творчыя характарыстыкі, праграмы выступленняў (Дадатак 4).

8. Падчас правядзення занальнага агляду-конкурсу кожны раён павінен прадставіць:
- выстаўку традыцыйных рамёстваў;
- конкурсную праграму працягласцю ад 20 да 40 хвілін, скіраваную на змястоўнае раскрыццё мастацкіх традыцый сваёй мясцовасці: адноўленыя і бытуючыя аўтэнтычныя песні каляндарнага і сямейна-родавага цыклаў, пазаабрадавыя песні, танцы (карагоды, сольныя, парныя, гуртавыя), гульні, інструментальную музыку, творы празаічных жанраў.

9. Выкананне аўтарскіх, апрацаваных альбо стылізаваных твораў, а таксама фанаграм не дазваляецца. Праграма выступлення фальклорных калектываў павінна складацца з песень, танцаў і музыкі ў абрадавым (святочным) кантэксце з выкарыстаннем адпаведнай атрыбутыкі і касцюмаў.

10. Упершыню ў рамках Фестывалю адбудзецца **конкурс этнаблогераў** на лепшае асвячэнне фестывалю (Дадатак 5).

11. За чатыры тыдні да правядзення заключных мерапрыемстваў Фестывалю на электронныя пошты РЦК, РЦКНТ будуць дасланы “Метадычныя рэкамендацыі па падрыхтоўцы і правядзенні абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору “Панямоння жыватворныя крыніцы” ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”.

12. Вылучэнне лепшых выканаўцаў, калектываў, майстроў народнай творчасці па выніках 1 тура ажыццяўляе журы (Дадатак 6).

13. Для удзелу ў заключных мерапрыемствах журы 1 тура адбірае лепшыя фальклорныя калектывы, індывідуальных выканаўцаў, майстроў народнай творчасці (па выніках 1 тура), фіналістаў конкурса этнаблогераў, аб чым усім удзельнікам паведамляецца дадаткова.

14. 2 тур Фестывалю – заключныя мерапрыемствы – адбудуцца 5 жніўня 2023 г. у г. Гродна.

15. Праграма 2 тура складаецца з вызначэння лепшых калектываў і выканаўцаў, заключнага канцэрта, выстаўкі-кірмашу вырабаў майстроў народнай творчасці аддзелаў рамёстваў і традыцыйнай культуры раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці, раённых Цэнтраў рамёстваў, урачыстага закрыцця Фестывалю.

16. Па выніках 2 тура журы (Дадатак 7) вызначае лаўрэатаў (I, II, III ступені) у наступных намінацыях:
- лепшае асвячэнне фестывалю;
- лепшы брэндавы сувенір;
- дарослы фальклорны ансамбль;
- дзіцячы фальклорны ансамбль;
- фальклорны інструментальны ансамбль;
- фальклорны танцавальны калектыў (побытавыя танцы);

- індывідуальны выканаўца (сольныя спевы, дуэты);

а таксама вылучае лепшых у <u>спецыяльных намінацыях:</u>

- самабытнасць і адметнасць выканальніцкага стылю;
- арыгінальнае адлюстраванне танцавальнай спадчыны свайго краю;
- дзейсная папулярызацыя абрадавых і святочных традыцый Гродзенскага Панямоння;
- лепшая рэжысура раённай праграмы ў 1 туры;
- за пераемнасць народных традыцый і інтэграцыю ў маладзёжнае асяроддзе;
- за самабытнасць акцёрскага майстэрства;
- лепшае адлюстраванне рэгіянальных традыцый у выстаўцы традыцыйных рамёстваў.

17. Пры падвядзенні вынікаў выступлення фальклорных калектываў журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі:

- валоданне рэгіянальнай манерай выканання;
- захаванне мясцовага рэпертуару і мастацкага стылю;
- узровень выканальніцкага майстэрства (чысціня строя, манера гукавымаўлення, тэхніка ігры на музычных інструментах);
- эмацыянальнасць і непасрэднасць выканання;
- дакладнае веданне кампазіцыі танца, народнага танцавальнага этыкету;
- культура нашэння касцюма;
- адпаведнасць фальклорнага рэпертуару ўзросту выканаўцаў;
- жанравая разнастайнасць;
- наяўнасць этнічных строяў;
- разнастайнасць відаў традыцыйных рамёстваў;
- рэжысёрскае вырашэнне прэзентацыі выстаўкі традыцыйных рамёстваў;
- захаванне традыцыйнага тэхналагічнага працэсу;
- эстэтыка афармлення экспазіцыі.

18. Журы пакідае за сабой права аб’ядноўваць альбо змяняць намінацыі, уводзіць дадатковыя намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду Фестывалю, падзяляць лаўрэацкія месцы і вызначаць дадатковыя спецыяльныя прызы, не прысуджаць званні лаўрэатам.

19. Лаўрэатам уручаюцца дыпломы ў рамках і прызы; пераможцам спецыяльных намінацый уручаюцца дыпломы ў рамках і спецыяльныя прызы.

20. Усе астатнія ўдзельнікі 2 тура ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел у Фестывалі.

21. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на заніс выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

22. Фінансаванне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

23. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: аплата працы членам журы, вядучым, праезд членаў журы, прызы, спецыяльныя прызы, рамкі для дыпломаў, выраб дыпломаў, аплата выступлення прафесійных і аматарскіх калектываў мастацкай творчасці.

24. Для фінансавання Фестывалю на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

25. Арганізатары Фестывалю пакідаюць за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама пераносіць дату правядзення Фестывалю (у іншыя тэрміны).

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору “Панямоння жыватворныя крыніцы”

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, сустаршыня аргкамітэта; |
| Чарняк Д.Р. | начальнік аддзела культуры Гродзенскага гарвыканкама, намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Кузьма Т.М. | начальнік аддзела культуры Гродзенскага райвыканкама; |
| Леўшунова Н.Ф. | начальнік аддзела культуры Лідскага райвыканкама; |
| Ляховіч В.І. | начальнік аддзела культуры Ваўкавыскага райвыканкама; |
| Пятрук А.П. | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”; |
| Шабановіч М.К. | начальнік аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама; |
| Ражава Т.М. | начальнік аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама |

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору "Панямоння жыватворныя крыніцы"

ГРАФІК
правядзення І тура (занальныя агляды-конкурсы)

**- 23 красавіка 2023 г. – Сапоцкінскі культурна-турыстычны цэнтр філіял ДУК "Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр".**

Прымаюць удзел:

- Бераставіцкі раён;
- Гродзенскі раён, г.Гродна;
- Мастоўскі раён;
- Шчучынскі раён.

**- 27 мая 2023 г. - філіял "Дзітвянскі Дом культуры" ДУ "Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці".**

Прымаюць удзел:

- Воранаўскі раён;
- Лідскі раён.

**- 3 чэрвеня 2023г. - ДУК "Навагрудскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці".**

Прымаюць удзел:

- Дзятлаўскі раён;
- Іўеўскі раён;
- Карэліцкі раён;
- Навагрудскі раён.

**- 11 чэрвеня 2023 г. - філіял "Жодзішкаўскі Дом культуры" ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры".**

Прымаюць удзел:

- Астравецкі раён;
- Ашмянскі раён;
- Смаргонскі раён.

**24 чэрвеня 2023 г. – г. Ваўкавыск, ДУК "Ваўкавыскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці".**

Прымаюць удзел:

- Ваўкавыскі раён;
- Зэльвенскі раён;
- Свіслацкі раён;
- Слонімскі раён.

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору “Панямонне жыватворныя крыніцы”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела культуры райвыканкама

2023 г.

ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласным фестывалі рэгіянальнага фальклору
“Панямонне жыватворныя крыніцы”

1. Назва конкурснай праграмы:

___

___

2. Спіс калектываў-удзельнікаў, індывідуальных выканаўцаў, майстроў народнай творчасці з майстар-класамі:

___

___

___

3. Прозвішча, імя, імя па бацьку і кантактны тэлефон рэжысёра-пастаноўшчыка (кіраўніка) конкурснай праграмы:

___

___

4. Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка конкурса этнаблогераў___

Подпіс кіраўніка ўстановы

Заяўкі дасылаюцца за тыдзень да правядзення занальнага агляду-конкурсу на электронны адрас ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” (info@gromc.by). Кантактныя тэлефоны ў Гродна: +375(152)623792, 687934.

Дадатак 4
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору “Панямоння жыватворныя крыніцы”

*УЗОР*

**Праграма выступлення**

_______________ раён

1) “Ой, бярыце ж каравай, бярыце” – вясельная песня (“спявалі, калі гатавалі каравай”). Зап. у 1998 г. В.Ц. Кульбіцкай у в. Валосавічы Акцябрскага раёна Гомельскай вобл. ад Анастасіі Астапаўны Юрчак, 1932 г.н.
   Выконвае дзявочая група калектыву (Юлія Бялько, Анюта Бялько…). (*Пажадана пазначыць узрост, напрыклад: вучні 10 кл.)*

2) “Некрашынская кадрыля” (на шэсць кален). Зап. у 2005 г. Л.А. Казаковай у в. Валосавічы Акцябрскага раёна Гомельскай вобл. ад Алены Аляксееўны Гарбар, 1926 г.н. Выконваюць чатыры пары.

3) “Расветаўскія падкіндэсы” – танцавальны найгрыш, выконваецца ў любы час. Зап. у 2007 г. М.А. Якімовічам у в. Расвет Акцябрскага раёна Гомельскай вобл. ад _____.
   Выконвае Ігар Дземенкавец, 1970 г.н. (гармонік), Мікіта Якімовіч, 1969 г.н. (баян), Васіль Багдановіч, 1938 г.н. (вясельны барабан).

Рэжысёр–пастаноўшчык _________________

Дырэктар _______________
подпіс

Дадатак 5
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору "Панямоння жыватворныя крыніцы"

Умовы правядзення конкурса этнаблогераў
на лепшае асвячэнне фестывалю

1. Агульнае палажэнне

1.1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення конкурса этнаблогераў на лепшае асвячэнне фестывалю ў рамках абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору "Панямоння жыватворныя крыніцы" (далей - конкурс).

1.2. Конкурс праводзіцца з 23 красавіка па 5 жніўня 2023 года.

2. Мэты і задачы

2.1. Мэтамі і задачамі конкурса з'яўляюцца: далучэнне да шырокіх слаёў грамадства традыцый і дасягненняў нацыянальнай культуры і мастацтва; далучэнне дзяцей, падлеткаў, моладзі да гісторыка-культурнай спадчыны сваёй краіны і прапаганда традыцыйнай народнай творчасці Панямоння, стварэнне ўмоў для эфектыўнай самарэалізацыі моладзі ў інтэрнэт-прасторы; павышэнне ўвагі да вывучэння мясцовых нацыянальных традыцый песенна-танцавальнага жанру, гульнёва-абрадавай спадчыны Гродзеншчыны, павышэнне турыстычнай прывабнасці Панямоння.

3. Умовы правядзення

3.1. У конкурсе прымаюць удзел падлеткі і моладзь ад 12 да 30 гадоў.

3.2. Для ўдзелу ў конкурсе патрэбна:

1) зняць кароткі відэаролік (да 7 хвілін) занальнага агляда-конкурса (Дадатак 2), у якім павінны змяшчацца выступленне фальклорных калектываў раёна, выстаўка традыцыйных рамёстваў;

2) апублікаваць відэаролік з нататкай на відэахостынгу Youtube, сваёй старонцы ў Instagram і іншых сацыяльных сетках інтэрнэт-прасторы ў сямідзённы тэрмін з дня правядзення занальнага агляда-конкурса. Выкладваць відэаролік трэба на публічна адкрытую старонку (не ў stories!);

3) пры публікацыі сваіх нататак выкарыстоўваць хэштэг #Панямоння жыватворныя крыніцы - 2023#.

3.3. Мова нататак і відэа – беларуская. Відэаролік павінен мець застаўку: назву раёна ці ўстановы культуры, дату здымання, загаловак.

3.4. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна да 10 ліпеня даслаць заяўку на электронную пошту ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”: info@gromc.by з пазначэннем “*назва раёна – на конкурс этнаблогераў*”. У заяўцы павінны быць: спасылкі на відэаролік; скрыншоты нататак, на якіх відаць колькасць праглядаў, лайкаў і каментары.

## 4. Падвядзенне вынікаў

4.1. Падвядзенне прамежкавых вынікаў конкурсу і вызначэнне трох фіналістаў адбудзецца да 20 ліпеня 2023 года.

4.2. Фіналісты запрашаюцца на заключныя мерапрыемствы Фестывалю ў г. Гродна 59 жніўня 2023 года, пад час якіх патрэбна зняць відэаролік для асвячэння фестывальнага дня з неадкладнай яго публікацыяй у сацыяльных сетках (ВК, Youtube, Instagram, Telegram).

4.3. Фінальныя відэаролікі будзе ацэньваць журы на працягу Фестывалю 5 жніўня 2023 года пасля іх публікацый у інтэрнэт-прасторы.

4.4. Крытэрыі ацэнкі работ конкурса:

- адпаведнасць матэрыяла з умовамі конкурсу;
- актуальнасць, дакладнасць, аргументаванасць, эксклюзіўнасць фактаў і глыбіня прапрацоўкі тэмы;
- адпаведнасць патрабаванням да мовы і стылю;
- тэхнічная якасць выканання;
- сцэнарны план і мантажная праца;
- артыстызм, знаходлівасць і крэатыў аўтара;
- колькасць праглядаў і лайкаў відэароліка ў сацыяльных сетках;

4.5. Пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэата I, II, III ступені ў рамках і прызамі.

## 5. Фінансаванне

5.1. Фінансаванне конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” на цэнтралізаваныя мерапрыемствы.

5.2. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуецца набыццё прызоў, дыпломаў у рамках.

5.3. Для фінансавання конкурсу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

6. Форма заяўкі

ЗАЯЎКА

на ўдзел у **конкурсе этнаблогераў**

“Лепшае асвячэнне фестывалю”

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку______________________________
_____________________________________________________________
2. Дата нараджэння_________________________________________
3. Месца пражывання, вучобы/работы кантактны тэлефон_____________________________________________________
_____________________________________________________________
_____________________________________________________________
4. База дзейнасці (установа культуры, навучальная ўстанова, іншае)
_____________________________________________________________
_____________________________________________________________
5. Назва відэароліка:
_____________________________________________________________

6. Спасылкі на відэаролік
_____________________________________________________________
7. скрыншот (фота) нататак, на якіх відаць колькасць праглядаў, лайкаў і каментары.

Кіраўнік установы ____________________

*(подпіс, ініцыялы)*

Дадатак 6
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору “Панямоння жыватворныя крыніцы”

СКЛАД ЖУРЫ
занальных аглядаў-конкурсаў

| | |
|---|---|
| Хільмончык Кацярына Васільеўна - | дырэктар ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, *старшыня журы;* |
| Рамановіч Наталля Іосіфаўна – | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”, |
| Барысевіч Яніна Анатольеўна - | загадчык аддзела традыцыйнай мастацкай культуры ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”; |
| Гарчычка Ірына Юрьеўна - | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”; |
| Пятрук Андрэй Пятровіч - | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”; |

Дадатак 7
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору “Панямоння жыватворныя крыніцы”

## СКЛАД ЖУРЫ
Заключных мерапрыемстваў Фестывалю

| | |
|---|---|
| Козенка Мікалай Аляксеевіч - | выкладчык этналогіі і мастацтваў УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, старшыня журы; |
| Клімовіч Алена Віктараўна - | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, сустаршыня журы; |
| Каліноўская Алена Тадевушэўна - | намеснік начальніка аддзела навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, намеснік старшыні журы; |
| Барысевіч Яніна Анатольеўна - | загадчык аддзела традыцыйнай мастацкай культуры ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”; |
| Гарчычка Ірына Юрьеўна - | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”; |
| Жук-Куніцкая Ірына Юр’еўна - | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Сахута Яўген Міхайлавіч - | доктар мастацтвазнаўства, прафесар, старшыня Беларускага саюза майстроў народнай творчасці; |
| Рамановіч Наталля Іосіфаўна - | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі АМЦНТ” |